*Г.М.Алейнік, Прэзідэнт Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

## ПРАФЕСІЯНАЛЬНАЕ АБ'ЯДНАННЕ ПАВІННА МАЦНЕЦЬ

Беларуская бібліятэчная асацыяцыя (ББА) была створана ў 1992 г. У лістападзе 1994 г. адбылася 2-я справаздачна-выбарчая канферэнцыя. Разам з абмеркаваннем вынікаў дзейнасці ББА за 2 гады на канферэнцыі былі адноўлены кіруючыя органы, унесены змены ў Статут і, што самае галоўнае, вызначаны шляхі яе далейшага развіцця. Стварэнне Асацыяцыі было прадыктавана часам. Даўно наспела неабходнасць актывізаваць грамадскі бібліятэчны рух, аб'яднаць намаганні і скаардынаваць дзейнасць працоўных калектываў бібліятэк усіх узроўняў і тыпаў, бібліяграфічных і інфармацыйных устаноў у інтарэсах развіцця бібліятэчнай справы на Беларусі.

У адпаведнасці з мэтамі і задачамі ББА, вызначанымі ў яе Статуце, выпрацаваны асноўныя напрамкі работы ў бліжэйшы час і на перспектыву:

— удзел у распрацоўцы і рэалізацыі бібліятэчнай палітыкі на Беларусі, распрацоўка канцэпцыі развіцця бібліятэчнай справы;

— садзейнічанне сацыяльнай абароне бібліятэчных работнікаў, павышэнню статуса бібліятэк у грамадстве;

— арганізацыя шматбаковай прафесійнай адукацыі, садзейнічанне ў падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі бібліятэчных спецыялістаў на розных узроўнях;

— задавальненне прафесійных інтарэсаў членаў ББА на дзяржаўным узроўні, у т.л. на падставе пашырэння міжнародных сувязей.

Першы этап дзейнасці ББА быў адзначаны даволі актыўнай работай па распрацоўцы канцэпцыі развіцця бібліятэчнай справы, закона аб бібліятэчнай справе, нарматыўна-рэгламентуючых дакументаў. На пасяджэннях рады ББА падымалася і абмяркоўвалася на прафесійным узроўні шмат іншых пытанняў, якія датычацца дзейнасці бібліятэк. Патрэбна адзначыць, што гэта стала магчымым у выніку правільна вызначанай арганізацыйнай структуры і ў першую чаргу — дзейнасці прафесійных камітэтаў, у якіх працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты.

Чаго не ўдалося зрабіць на першым этапе — дасягнуць актыўнасці ў пашырэнні членства ББА бібліятэк і іншых устаноў, звязаных з

бібліятэчнай справай. Гэта сведчыць аб тым, што дзейнасць ББА не ўвайшла яшчэ ў свядомасць бібліятэчнай грамадскасці. Адна з асноўных прычын гэтага — адсутнасць прафесійнага друкаванага выдання. Яно змагло б пашырыць непасрэдны ўдзел як бібліятэкараў, так і грамадскасці ў абмеркаванні праблем і пошуку шляхоў выхаду з крызіснага стану, у якім апынуліся бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Таму адной з галоўных задач Асацыяцыі застаецца арганізацыя паўнацэннага друкаванага бібліятэчнага часопіса.

Развіццё навукі, культуры і у т.л. інфарматыкі патрабуе карэнных змен, якія мы павінны здзейсніць у бібліятэчнай справе, каб застацца ў рамках сусветнага развіцця. А гэта немагчыма без скаардынаваных рашэнняў і ўзаемадзеяння ўсіх бібліятэк і бібліятэчных работнікаў.

Перш за ўсё неабходна стварыць прававую прастору для дзейнасці бібліятэк, у якой, з аднаго боку, павінна быць адзначана адказнасць дзяржавы і мясцовых органоў улады за захаванне і развіццё бібліятэчнай справы, з другога — адказнасць бібліятэк перад грамадствам. Першым крокам у гэтым напрамку з'явіўся Закон "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь", падпісаны Прэзідэнтам у сакавіку бягучага года, і шэраг распрацаваных нарматыўна-рэгламентуючых дакументаў. Гэта работа патрабуе прадаўжэння. На чарзе распрацоўка вельмі патрэбнага бібліятэкам і органам інфармацыі Закона "Аб абавязковым экземпляры" і іншых нарматыўных дакументаў.

Не менш значным напрамкам з'явіцца распрацоўка адзінага фармату машыначытаемых запісаў для бібліятэк рэспублікі, што будзе спрыяць стварэнню нацыянальнага электроннага каталога кніг і перыядычных выданняў і інтэграцыі яго ў сусветныя банкі даных.

Па-ранейшаму важнымі і складанымі застаюцца праблемы камплектавання і захаванасці фондаў бібліятэк. Жыццёва неабходнымі з'яўляюцца пошукі шляхоў і метадаў сацыяльнай і прававой абароны бібліятэкараў. Па меры ўмацавання матэрыяльнай базы Асацыяцыі, якой не ў малой ступені будзе спрыяць пашырэнне членства, з'явіцца магчымасць пачаць рэалізацыю сацыяльных мерапрыемстваў для бібліятэчных работнікаў, пашыраць міжнародныя сувязі, у т.л. уступленне ў міжнародныя бібліятэчныя асацыяцыі, садзейнічаць павышэнню кваліфікацыі.

Рада ББА спадзяецца, што канкрэтная работа Асацыяцыі знойдзе шырокую падтрымку ў бібліятэк і бібліятэчных работнікаў, і заклікае іх да актыўнасці. Сціпласць заўсёды была адметнай рысай большасці

прадстаўнікоў бібліятэчнай прафесіі, але зараз час патрабуе ад іх рашучых дзеянняў. Яны павінны даказваць сваю неабходнасць грамадству не толькі ўласнымі канкрэтнымі справамі. Мэтанакіраванае аб'яднанне іх прафесійных і творчых магчымасцей — . Беларуская бібліятэчная асацыяцыя. Моц яе голасу будзе залежаць ад нашага шматлікага адзінства.

Разліковы рахунак ББА 3012200530019 у Ленінскім аддзяленні АКБ Белбізнесбанка МФО 763.